БЕЛАРУСКІ ЧАС

14 СТУДЗЕНЯ 2023 г

#05

ПРАЧЫТАЎ САМ – ДАЙ ПРАЧЫТАЦЬ ІНШАМУ

«СБИТЫЕ ЛЁТЧИКИ»

В советское время оставшихся в живых лётчиков, которых сбили или после аварии, переводили на работу, не связанную с полётами. Как правило, ставили на должности замполитами либо кадровиками. Отличались такие люди психическим нездоровьем и неадекватностью. С тех пор в обиход и вошло это выражение — «сбитые лётчики». Люди, которые больше ни на что не годятся, тихо дослуживают или доживают свой век.

Замполиты переименовывались в армии в воспитателей, а теперь называются идеологами. Что же это за военнослужащие и какую работу они ведут?

Начиная с августа 2020 года, когда были подтасованы выборы, путь идеологов в Беларуси — это непрерывная цепочка преступлений, предательств и лжи.

Помощником министра обороны по идеологической работе в вооружённых силах, начальником главного управления по идеологии назначается Касинский Леонид Викторович. Под его руководством и были произведены масштабные фальсификации выборов в армии Беларуси. Многочисленные факты нарушения зафиксированы не только в воинских частях, но и в военных учебных учреждениях. В настоящее время под руководством этого человека происходит трансформация сознания военнослужащих Беларуси с целью склонения к измене родине. Навязывается мысль о том, что мы — часть великой империи, идёт работа по дискредитации национальных символов. Вся информационная повестка берётся из российских пропагандистских чатов. В телеграм-каналах военных частей регулярно размещаются российские рекламные ролики о войне с Украиной. В них война называется спецоперацией и рассказывается о боевых подвигах военных. Конечно, за кадром остались убитые дети и замордованные в подвалах местные жители, изнасилованные женщины и стёртые в порошок жилые районы. Треть украинцев стали беженцами — это 10 миллионов. Но главному идеологу и его команде это неинтересно. Они хотят побед и звёзд на своих погонах. В борьбе за звёзды и милость вождя жизни людей становятся разменной монетой, не больше.

По военным телеграм-каналам уже публикуются исторические очерки российской империи, рассказы о её царях и военачальниках. Истории Беларуси нет. Курируют эти каналы идеологи.

Откуда же берутся эти люди — замполиты? Организация Байпол провела расследование по карьерному росту некоторых идеологов. И что же обнаружилось? В молодом возрасте уже набор медалей, одна одной удивительней. Например, медаль «100 год Узброеных сіл Беларусі». Однако обладатель этой медали в тот год ещё учился в школе! В личных фотографиях мы видим уже другой комплект, однако такие же удивительные медали, которые парень в силу возраста просто не мог иметь. Захотелось покрасоваться?

Изоляция от реальной информации и жёсткая пропаганда — вот средства, которыми из парней, принимающих присягу на верность народу Беларуси, надеются сделать верных холуёв преступной власти. Ежедневно идеологические работники организуют просмотр «правильных» новостей, у солдат отбирают телефоны, все подписаны на пропагандистскую периодику, которая исключительно на русском языке. В страшные дни августа 2020 года, когда проводились массовые избиения, когда сотнями хватались с улиц люди и бросались в автозаки, эти газеты сообщали солдатам, что в стране всё хорошо и спокойно.

Некоторые идеологи получают свои должности, даже не имея соответствующего образования. Верность и готовность исполнять любые приказы компенсирует нынче все недостатки.

Какую же пользу принесут идеологи в случае реальной беды? Когда надо проявлять инициативу и профессионализм? Никакой. Как сбитые лётчики, они ни на что не годятся. Но разница в том, что если раньше это были дармоеды, сейчас это преступники и предатели своей страны.

ВВЕДЕНИЕ В РУССКИЙ МИР ДЛЯ ДЕТЕЙ

Русский мир неумолим. Если взрослым людям его влияние заметно, то с детьми, конечно, всё иначе. Российская пропаганда подготавливает наших ребят заранее. Так, перед новым годом посольство России в Беларуси устроило между детьми конкурс: нужно было нарисовать себя на Кремлёвской ёлке и написать сочинение о приключениях беларусов в Москве. Подарком на конкурсе был однодневный тур в российскую столицу. Заявлялось, что «акция — один из шагов по укреплению гуманитарных связей в Союзном государстве и поощрение молодых талантов». Для беларусских детей, которые едут на Кремлёвскую ёлку, ОАО «Российские железные дороги» выделили даже специальный вагон, что преподносится российскими и беларусскими СМИ как акт невероятной щедрости.

Вы скажете: *«Ничего страшного, это же просто праздник для детей?»* Но нет. Как оказалось, программа не ограничилась шоу в Кремле, на котором беларусские дети побывали вместе с детьми с оккупированных Россией территорий Украины. После школьников отвезли в «МуЗей Победы». Именно так сейчас называется музей на Поклонной горе, посвящённый победе во Второй мировой. К слову, сейчас там проходит выставка, посвящённая погибшим в Украине российским оккупантам. В общем, всё перевёрнуто с ног на голову. Современный фашизм в музее победы над фашизмом.

Но дети же ещё не всё понимают. И задача пропагандистов удалась:

— Минск, конечно, тоже хорош, но здесь красивее и сохраняется больше истории, — сказал о Москве один из детей, посетивших Кремлёвскую ёлку. *— Это развлечения и радость. И ты ощущаешь то, что ты попал в Москву, а Москва — это целый божественный город.*

Как сообщила директор гимназии N50 Лола Пахомова, в конкурсе приняли участие 85 учеников 2–3 классов. *«Хотелось, чтобы дети доказали своё искреннее желание. <…> Дети представляли себя в Москве. И рассказали, что ощущали бы себя как родные для россиян люди. Дети ждут праздника и чуда. Программа насыщенная»,* — рассказала она.

Насыщенная настолько, что детям кроме ёлки в Москве решили предложить музей собственной агрессии, в котором восхваляются люди, ушедшие ни за что убивать своих соседей?

Вот такой бесплатный русский мир для беларусских детей. Что крайне опасно для будущего Беларуси. Почему? Потому что детям показывают «красивую» сторону России, прячут пропаганду под детский праздник. Ведь для чего ещё везти их в музей нынешней несправедливой агрессивной войны против другого государства? Детей учат, что это норма, детей учат, что Россия, такая, как она есть сейчас, со своим империализмом и захватом чужих территорий, убийствами мирных граждан ради политических амбиций властей — это хорошо, это нормально, так может быть. Может, и Беларусь однажды станет её частью...

ЦІ МАГЧЫМА ВЫРАТАВАЦЬ РЭГІЁНЫ АД ГАЛЕЧЫ?

Амаль кожнаму жыхару Беларусі, які хоць раз глядзеў тэлебачанне, вядома рыторыка ўладаў аб развіцці рэгіёнаў. Лукашэнка час ад часу ездзіць па краіне, тыкае пальцамі ў брудных кароў і чарговы раз папулісцкі заяўляе, што нельга ўсё насельніцтва збіраць у Мінску.

Але рэальнасць, як гэта часта бывае, адрозніваецца ад малюнку ў тэлевізары. 60% насельніцтва Беларусі пражывае ў 20 буйнейшых гарадах краіны, у вёсках наогул засталося толькі 22% насельніцтва. Больш паловы ўсяго прыбытку Беларусі дае Мінск і Мінская вобласць. **Як гэта атрымалася, і што з гэтым рабіць?**

Па-першае, наша сучасная эканоміка амаль без рэформаў засталася нам ад СССР. З часу яго распаду прайшло ўжо больш 30 гадоў, і прынцыпы, па якім яна працавала тады, ужо не актуальны зараз. Савецкая эканоміка існавала не столькі для заробку грошай, колькі для пераразмеркавання нафтадолараў унутры краіны, каб згладзіць сацыяльную дыстанцыю і зрабіць усіх «аднолькава беднымі». Ды і гэтая мадэль не працавала — усё залежыла ад продажу нафты. Чым гэта скончылася, памятаюць тыя, хто застаў канец 80-х. Усе гады пасля развалу сённяшнюю мадэль дапамагалі захаваць датацыі ад Расіі, але зараз, калі Расія сама страціла шмат грошай на вайну ва Украіне, беларуская эканоміка стала тануць следам.

Па-другое, беларускі ўрад не мае доўгатэрміновага плану на развіццё рэгіёнаў. А нават калі і меў бы, ён бы хутка змяняўся ад палітычных абставінаў навокал, менавіта ад настрою Лукашэнкі, якому б не спадабаліся чарговыя каровы ці брудныя заводы.

Па-трэцяе, у Беларусі існуе застарэлая сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Яна складаецца з трох узроўняў — 6 абласцей і Мінск; 118 раёнаў і 10 гарадоў абласнога падпарадкавання; 104 гарады, 27 пасёлкаў і 1154 сельсаветы раённага падпарадкавання. Для такой кампактнай краіны, як Беларусь, гэтая колькасць адміністрацыйных адзінак завышана і вядзе толькі да пашырэння лічбы чыноўнікаў. Але колькасць чыноўнікаў не азначае іх якасць, і гэта лішні раз падкрэсліваюць чарговыя візіты Лукашэнкі па кароўніках і іншых прадпрыемствах. Складана ўявіць, каб прэзідэнт любой іншай еўрапейскай краіны займаўся б працай чыноўнікаў мясцовага ўзроўню — гэта сведчыць аб неэфектыўнасці сістэмы, якая існуе зараз.

І па-чацвёртае, нягледзячы на такую колькасць чыноўнікаў нізавога ўзроўню, у краіне фактычна адсутнічае інстытут мясцовага самакіравання — калі мясцовая ўлада выбіраецца жыхарамі і нясе адказнасць перад сваімі землякамі. Старшыні выканкамаў на раённым узроўні і вышэй прызначаюцца асабіста Лукашэнкам, і часта гэта людзі з другой мясцовасці, без ведаў лакальных праблем. Гэта вядзе да таго, што мясцовыя жыхары не бачаць сэнсу ўдзельнічаць у жыцці свайго рэгіёну — ім прасцей з'ехаць у Мінск,

куды ўлады накіроўваюць каля 30% усіх унутраных інвестыцый у краіне.

Таксама мясцовыя ўлады не маюць правоў змяняць законы, падаткі, нават не вырашаюць, куды накіраваць атрыманыя з рэспубліканскага бюджэту грошы — толькі па ўзгадненні з кіраўніцтвам. Саветы дэпутатаў, якіх выбіраюць мясцовыя жыхары, ні на што не ўздзейнічаюць — у іх няма ўплыву на ўладу ці магчымасці размеркавання грошай.

Як выратаваць рэгіёны? На гэта сёння ёсць адказ з улікам вопыту, які набылі ўжо іншыя краіны пры пераходзе ад савецкай эканомікі да рыначнай.

Першае — трэба стварыць доўгатэрміновы план развіцця рэгіёнаў і асабісты орган улады, які будзе сачыць за выкананнем гэтага плану.

Другое — трэба павялічыць актыўнасць грамадзян у мясцовым кіраванні. Для гэтага неабходна рэформа мясцовай улады са стварэннем інстытуту мэраў і здольнасцю ўлады кіраваць мясцовым бюджэтам і падаткамі, як гэта існуе ў большасці краін свету.

Трэцяе — рэформа адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Трэба адмовіцца ад сучаснай суперцэнтралізацыі, у якой ёсць «Мінск» і «астатняя краіна». Дастаткова стварыць двухузроўневую сістэму з 15-20 субрэгіёнамі і падтрымліваць эфектыўныя галіны эканомікі ў іх, а не ствараць «ураўнілаўку».

І, нарэшце, далучаць да кіраўніцтва сапраўдных прафесіяналаў — эканамістаў, юрыстаў, прадпрымальнікаў і іншых спецыялістаў. Менавіта яны здольныя рэфармаваць такія важныя для нашай краіны сферы, як транспарт і адукацыя. Зараз большая частка чыноўнікаў складаецца з людзей, якія выйшлі з пасад у сельскай гаспадарцы, ці былых ідэолагаў. Але эканоміка краіны ў 21-м стагоддзі значна складанейшая за эканоміку калгаса.

Спадзяемся, цяперашняму пакаленню беларусаў давядзецца прымаць удзел у гэтых рэформах і скарыстоўваць той вопыт, які многія набылі ў эміграцыі.

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ: «УСЯ НАША КУЛЬТУРА ЗАСНАВАНА НЕ НА ЛЮБОВІ, А НА ГВАЛЦЕ»

Святлана Алексіевіч (на фота) — самая вядомая ў свеце беларуская пісьменніца і адзіная наша пісьменніца, якая атрымала Нобелеўскую прэмію па літаратуры, якой удастойваюцца лепшыя з лепшых аўтараў свету. Кнігі нашай зямлячкі перакладзены на 30 моў, выходзяць мільённымі тыражамі, па іх у розных краінах зняты каля 15 фільмаў.

Алексіевіч стварыла ў літаратуры асобны жанр — раман-споведзь. Пісьменніца знаходзіць незнаёмых і нікому невядомых людзей, якія дзеляцца сваімі маленькімі асабістымі гісторыямі, аб`яднанымі агульнай тэмай, — і з гэтага складаецца вялікая гісторыя.

Пісьменніца сябравала з Васілём Быкавым і Алесем Адамовічам і лічыць іх сваімі настаўнікамі. У 2020 годзе пасля допыту ў сілавікоў яна вымушана была пакінуць Беларусь, каб не апынуцца за кратамі за падтрымку пратэстаў за сумленныя выбары.

З інтэрв'ю С. Алексіевіч «Нашай Ніве»:

«Уся наша культура заснавана не на любові, а на гвалце. І мы ж бачым гэта. Гвалт — гэта не толькі ваенная аперацыя. Гэта і хатні гвалт, і дваровы гвалт, гвалт усюды, шмат разнавіднасцяў гвалту, мы выраслі ў гэтай культуры.

Я не ведаю, колькі людзей цяпер чытаюць кнігі. Раней мы выхваляліся, што мы такая духоўная краіна. Я шмат бываю на Захадзе, і я б словы «самая духоўная краіна» цяпер ніколі не сказала б. Таму што я бачу тут людзей, якія значна больш шануюць уласнае жыццё і наогул жыццё. Тут моладзь ездзіць ратаваць нейкіх птушак, пінгвінаў, выступае супраць высечкі лесу. Гэта ўжо зусім іншая філасофія нараджаецца. А ў нас пра гэта і гаворкі няма, мы як у сярэднявеччы. Выцягнулі танкі з запаснікаў і страляем.

Беларусы заўсёды паважалі ўкраінцаў і наадварот. Памятаю, едзеш па Беларусі, раптам заходзіць размова — хто вы, што вы. І вось я кажу, што мая маці ўкраінка, і беларусы заўсёды ветліва ўсміхаюцца. А калі я была ва Украіне, казала, што бацька ў мяне беларус, і была такая ж рэакцыя людзей.

У Беларусі няма такой звярынай падтрымкі вайны, як у Расіі. Ну, можа, набяруць трохі добраахвотнікаў за грошы. Але я разумею, што наша Беларусь акупаваная. Усё вырашае Пуцін, а не Лукашэнка. Вельмі соpамна.

У Расіі мы маем справу з рускім фашызмам. І калі паглядзець на трыццатыя гады ў Германіі, што гаварыў і рабіў Гітлер, усё жудасна падобна, і мы ведаем, як гэта зараз разліва, гэта можа ахапіць увесь свет. І пытанне: чаму фашызм зноў вяртаецца да нас? Чаму чалавек не можа яму супрацьстаяць? На гэтыя пытанні я спрабую адказаць у сваёй новай кнізе.

Але я гляджу на маладых беларусаў. Яны вельмі хутка становяцца рэвалюцыянерамі, значна хутчэй, чым думае Лукашэнка ці Пуцін. Яны будуць іншымі. Яны не прымуць гэтага сярэднявечча. Гэта немагчыма. Не могуць такія людзі, як Лукашэнка і Пуцін, спыніць час. Зараз адбылася такая незразумелая рэч: мінулае апынулася наперадзе, і яно кіруе сённяшнім днём. Старыя людзі кіруюць намі, тымі, хто хоча жыць інакш.

Калі Лукашэнка сыдзе, гэта будзе балючы працэс, таму што нацыя прыніжаная. Вялікая колькасць людзей прайшла праз турмы, а там проста расчалавечваюць і зневажаюць. Нам будзе вельмі цяжка ад гэтага адысці. І другое: хоць мы арміяй не ўдзельнічаем у вайне супраць Украіны, гэта таксама вялікая траўма для нашай самасвядомасці, пачуццё віны, што мы былі саўдзельнікамі. Паверце мне. Я думаю, мы не адразу станем свабоднымі і моцнымі».

Водгук на кнігу «Цынкавыя хлопчыкі»:

«Гэта без слёз чытаць немагчыма. У мяне самой двое сыноў-падлеткаў. Кожнае апавяданне — усё так шчыра, па-жаночаму... Як пра сваіх хлапчукоў чытала. Як у звычайнай размове паміж маткамі: як нараджала, як першыя крокі зрабіў, якія адзнакі ў школе атрымліваў, а потым — як цынкавую труну ў кватэру занеслі... Нават цяпер пішу, а слёзыградам бягуць. Касцьмі лягу, а сваіх дзетак нікуды і ніколі не пушчу. У гады Вялікай Айчыннай вайны людзі гінулі за вызваленне ад чужынцаў, якія напалі на нашу краіну, а ў Афганскай вайне за што гінулі?! 18-гадовыя хлопчыкі былі кінуты на незразумелую вайну. Навошта?»

(Ірына, Глуск)

Шукайце творы Святланы Алексіевіч у кнігарнях і бібліятэках. А яшчэ можна іх бясплатна чытаць у Інтэрнэце. Для гэтага напішыце ў вакне пошуку назву аднаго з твораў:

«Цинковые мальчики»/«Цынкавыя хлопчыкі»;

«У войны не женское лицо»/«У вайны не жаночы твар»;

«Чернобыльская молитва»/«Чарнобыльская малитва».

В ШАГЕ ОТ ВОЙНЫ

В то время как весь цивилизованный мир помогает армии Украины военной техникой, боеприпасами, обмундированием, в Беларусь продолжает поступать военная техника из России: БТР-82А, БТР-80К, бронированные медицинские и ремонтно-эвакуационные машины, вертолёты с буквой Z. Эта буква — символ агрессии российской армии, значит, техника идёт на фронт. Но беларусские власти продолжают настаивать, что она поступает для «обеспечения безопасности и в соответствии с планом перевооружения».

Чью безопасность собираются обеспечивать, если война идёт на территории Украины и ВСУ защищает свою землю и не собирается нападать на Беларусь? Первая попытка, закончившаяся неудачей, была предпринята в самом начале войны.

Похоже, Лукашенко, который много лет утверждал, что Польша «бряцает оружием» и готовит нападение на Беларусь, решил «побряцать» сам, причём не своим, а российским, направив его в сторону Украины.

Российская армия уже в Беларуси!

Так, 7 января в 02:10 через станцию Смоленск в направлении Беларуси проследовал спецэшелон с 15-ю пассажирскими вагонами с личным составом ВС РФ ≈ 800 человек. Ранее на территорию Беларуси прибыли около 10 000 российских военных.

Сначала МО Беларуси объявило о совместных с Россией «лётно-тактических учениях», которые начнутся 16 января и будут проходить до конца месяца. А позже — о создании совместной группировки войск, которая приступила к «вооружённой защите союзного государства» в связи «с обострением ситуации на его западных границах».

По мнению советника Офиса Президента Украины А.Арестовича, в Беларуси военных готовят для переброски в Донецк и на другие направления, но об атаке на Киев речи не идёт. *«Та партия людей, которая туда [в Беларусь] зашла, отправилась в учебные центры, чтобы подготовиться и выехать на то же донецкое направление»,* — заявил Арестович.

Что делать?

Беларусам не нужна война. Глупо верить в рассказы про «священный долг» защищать Родину, если на неё никто не нападает. Пока же наших мужчин вызывают в военкомат якобы «для сверки», но вклеивают мобилизационные предписания. Значит, готовят отправить на войну, чтобы убивать украинцев или вернуться грузом 200, что вероятнее всего.

Берегите своих мужчин! Объясняйте им, что у них нет обязанности участвовать в войне, воевать на стороне оккупантов — это преступление. Они имеют право отказаться подписывать контракт. Ведь у них всего одна жизнь. Какой смысл отдать её ради удовлетворения амбиций двух обезумевших правителей?

ЦІ МОЖА БЕЛАРУСЬ СТАЦЬ ДРУГОЙ ФІНЛЯНДЫЯЙ?

Якая будучыня чакае Беларусь? Хочацца, вядома, найлепшую. Згодна з Сусветным дакладам шчасця, у пяцёрку самых шчаслівых краін за 2022 год увайшлі Фінляндыя, Данія, Ісландыя, Швейцарыя і Нідэрланды. Беларусь у гэтым спісе толькі 65-я, а Расія ажно 80-я з 148 краін.

Што перашкаджае Беларусі стаць другой Фінляндыяй? Быць сярод дэмакратычных, квітнеючых, мірных, інклюзіўных грамадстваў? Паміж краінамі шмат падабенства, але… дарогі разышліся яшчэ пасля ІІ Сусветнай, калі Беларусь рушыла ў бок будаўніцтва светлай камуністычнай будучыні, а потым, калі была магчымасць атрымаць незалежнасць, трапіла ў падпарадкавальнасць да Расіі, дзе і знаходзіцца апошнія 25 год.

Мова — галоўны складнік

У Фінляндыі, як і ў нас, адсутнічала «свая» этнічная дзяржава, бо ў мінулым на яе доўгі час значна ўплываў Крэмль. Але краіна здолела паступова пазбавіцца ад умяшання знешніх сіл і пабудаваць узорную ліберальную дэмакратыю. Як і ў Беларусі, шлях да дамінавання роднай мовы быў доўгім — фактычна спаборнічалі фінская, шведская і руская, што падобна да сітуацыі з беларускай, рускай і польскай у нас. Амаль за сто год фінская мова канчаткова замацавалася ў вышэйшай адукацыі, культуры і грамадстве. Ведаць некалькі замежных моў не так і складана.

Паўночная мадэль з элементамі сацыялізму

З «сацыялістычнай спадчыны» ў Фінляндыі, як і іншых Паўночных краін, засталася вялікая доля занятых у дзяржаўным сектары эканомікі, амаль 100% ахоп працоўных прафсаюзамі, бясплатная вышэйшая адукацыя, медыцына і догляд за старымі. Гэта вельмі прывабна для краін з рэальнай

рынычнай эканомікай, бездакорным забеспячэннем праў чалавека і выкананнем дэмакратычных працэдур. Дарэчы, у Паўночных краінах добра рэалізаваныя ідэі пабудовы «плоскага грамадства» дзеля мінімізацыі сацыяльнай няроўнасці.

Што не так?

Беларусь шмат у чым падобная да Скандынаўскіх краін па плошчы, шчыльнасці насельніцтва, асаблівасцях агракліматычных умоў і абмежаванай колькасці мінеральных рэсурсаў.

Але паглядзім на асноўны паказчык эканамічнага стану краіны — ВУП (унутраны валавы прадукт) — кошт усіх выраблены тавараў і паслуг выключна для спажывання, своеасаблівы «тэрмометр». Калі ВУП расце, то ўсё добра, а калі зніжаецца, то ў краіне чакаецца ці ўжо наступіў крызіс. Для параўнання — у Фінляндыі 5,5 млн чалавек, ВУП амаль 300 млрд $. У Беларусі 10 млн, ВУП – 68 млрд $. Беларусь каціцца ў бездань.

Чаму так стала? Зашмат стратэгічных памылак ды «ручное» кіраванне замест рынычнай эканомікі. Замест мадэрнізацыі вытворчасці — «забітыя» неканкурэнтаздольнай прадукцыяй склады, стратная сельская гаспадарка, а зараз і інвестары сыходзяць разам з капіталам. Да таго ж апошнія 27 год увогуле «свой шлях» — барацьба з роднай мовай ды з тымі, хто хоча перамен.

Пакуль у Беларусі кладуць асфальт наўпрост у снег ды цэлую вясну змагаюцца з ямінамі, у Фінляндыі для захавання сродкаў робяць «цёплыя дарогі» і тратуары з падагрэвам. Ну і вішанька на торце — каб адправіць дзіця ў школу, не трэба браць крэдыт, бо ўсё да алоўка дадуць бясплатна. А калі добра вучыцца, яшчэ і стыпендыю.

Замест высновы

У паўночных краінах прыярытэтам з’яўляецца развіццё эканомікі ведаў. Гэты ж самы падыход выглядае непазбежным і для нас. Скандынаўская мадэль не ідэальная і не прэтэндуе на тое, каб ёй быць. Але добры ўзор для нас, беларусаў.

Распространяется бесплатно. Тираж 299 экземпляров.